Не пакідайце ж мовы нашай беларускай,
каб не ўмёрлі! *Францішак БАГУШЭВІЧ*

НАША СЛОВА

№ 20(30) • **3—9 ЛІПЕНЯ** 1991 г. • **Штотыднёвік Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны**
Кошт 10 кап. (па падпісцы — 5 кап.)

Поступ тыдня

Закончыла сваю работу чацвёртая сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі. Ею прынята больш за восемдзесят заканадаўчых актаў. На апошніх яе пасяджэннях найбольшыя спрэчкі выклікаў праект закона аб увядзенні прэзідэнцтва. І толькі, відаць, у Беларусі маглі весціся пры гэтым дыскусіі наконт абавязковага ведання кіраўніком дзяржавы беларускай мовы. Як і трэба было чакаць, закончыліся яны тут безвынікова.

Мы прывыклі, што міжнародную палітыку вырашае ў нас Масква. А як быць з аб'яўленым нядаўна суверэнітэтам саюзных рэспублік? У пачатку года знойдзена новая форма кіравання — створаны Савет міністраў замежных спраў Саюза ССР. Нядаўна ў Мінску міністры сабраліся на чарговую нараду. На гэты раз галоўнай тэмай размовы стала аб'яднанне намаганняў па ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай трагедыі.

У друку нярэдка можна сустрэць выказванні вядомых вучоных пра тое, што, моў, пераканаўчых звестак аб уздзеянні радыяцыі на чалавека няма. І вось нядаўна ў праграме «Час» Цэнтральнае тэлебачанне паказала ўсёй краіне мінскую гематалагічную бальніцу, дзе лечацца дзеці з забруджаных зямель. Неабвержныя звесткі апублікаваны і беларускім вучоным М. А. Картэлем: захворванне дзяцей з чарнобыльскай зоны ў некалькі разоў вышэй, чым у кантрольных групах і ў дарослых. А, галоўнае, гэтыя дзеці робяцца больш адчувальнымі да радыяцыі.

Некалькі рабочых з прамысловых прадпрыемстваў Оршы прынялі ўдзел у галадоўцы каля памяшкання гарвыканкома. Яны пратэставалі супраць звальнення іх з работы за актыўнасць пры правядзенні красавіцкай забастоўкі. Некаторыя з рабочых выязджалі нават ў Мінск, каб правесці мітынг насупраць Дома ўрада. Былыя забастоўшчыкі вымушаны дабівацца аднаўлення на рабоце, хоць пракурор горада і гарвыканком задаволілі іх патрабаванне, а адзін з арганізатараў забастоўкі Мікалай Разумаў абраны за гэты час старшынёй прафкома на сваім заводзе.

Нягледзячы на тое, што ўсе фармальнасці з афіцыйным прызнаннем Беларускага Народнага Фронту былі ўрэгуляваны яшчэ ў мінулым годзе, юрыдычна ён быў зарэгістраваны, па паведамленнях друку, толькі нядаўна.

Першага ліпеня будзе пазначана ў календарах як пачатак афіцыйнага беспрацоўя ў рэспубліцы. Цяпер, пэўна, ужо ніхто не сумняваецца: калі прыйшло беспрацоўе, значыць, прыйдзе і доўгачаканы рынак...

Нарэшце вынесены абвінавачвальныя прыгаворы па справе аб вядомых падзеях 7 лістапада мінулага года ў Мінску. Аднаго з асуджаных узялі пад стражу, некалькі чалавек далі падпіску аб нявыездзе.

«Сфера влияния» ці самастойная дзяржава?

Стар. 2

Несалодкае жыццё беларускай дыяспары

Стар. 2

Але!

Беларускія задачкі часоў галоснасці

Доблесны генерал Усхопчык перабраўся са сталіцы Літвы ў Брэст.

ПЫТАННІ:

1. Герой крывавага бліцкрыга на Віленскі тэлецэнтр будзе там адразу нешта штурмаваць ці спачатку паспрабуе ў зацішным Мухаўцы адмыць свой мундзір?

2. Рыхтаваць для беларусаў «Комитет национального спасения»? І ў хуткім часе трэба чакаць ягоныя танкі ў Мінску?

3. А наогул: хто запрасіў генерала ў суверэнную Беларусь?

СТВАРАЕЦЦА ЦЕНЯВЫ КАБІНЕТ

Ценявы кабінет міністраў у рэспубліцы: прагноз ці рэальнасць? Адназначны адказ на гэта пытанне пакуль не дадзены. Але парламенцкая апазіцыя Беларускага Народнага Фронту, па словах галавы будучага ўрада, народнага дэпутата БССР Уладзіміра Заблоцкага, які, мяркуецца, зойме гэту пасаду, ужо шукае юрыдычныя асновы, якія дазволяць мець апазіцыйныя структуры ў рамках цяперашняй Канстытуцыі. Гэта нармальная з'ява ў грамадстве, якое набліжаецца да дэмакратыі, лічыць ён.

На здымку: у размове аб стварэнні магчымага ценявога кабінета ўдзельнічаюць У. Заблоцкі (злева), З. Пазняк, А. Трусаў (справа) і іншыя.

Фота У. МЯЖЭВІЧА. (БЕЛТА).

Адрадзіць зруйнаванае!

ШАНОЎНЫЯ СПАДАРЫ! Дасылаю Вам Зварот да праваслаўных вернікаў на беларускай мове, які распаўсюджваецца ў Віцебску. Прапаную надрукаваць з яго некалькі фрагментаў у «Нашым слове».

З павагай народны дэпутат БССР Алег Трусаў.

«Паважаныя жыхары Зямлі Віцебскай! Вам, безумоўна, неабыякавы лёс культурнай спадчыны нашага роднага горада? Калі так, то запрашаем вас прыняць удзел у яго адраджэнні.

Вялікія незаменныя страты духоўных багацяў народа звязаны са шматлікімі разбурэннямі, якія практычна сцерлі з зямлі наш старажытны горад. За гэтыя доўгія гады вынішчалася наша мінулае, гістарычная памяць. А, як вядома, без мінулага не можа быць будучага. Прыйшоў час вярнуцца да адраджэння разбуранага.

Для гэтага трэба пачаць аднаўленчыя работы менавіта з цэнтраў калісьці працвітаўшага ў Віцебску духоўнага жыцця — храмаў, школ, вучылішч.

Сярод іх такія, як:

1) Успенскі сабор і манастыр, 2) Благавешчанская царква, 3) Уваскрэсенская (рыначная) царква, 4) Капліца ў гонар 50-годдзя ўз'яднання уніятаў з праваслаўнымі, 5) Свята-Успенскі храм (у батанічным садзе), 6) Казанскі храм, 7) Царква Нараджэння Хрыстовага (была размешчана каля цяперашняга Дома піянераў), 8) Мікалаеўскі Кафедральны Сабор, 9) Свята-Духаўская царква (цяпер так званая «Ратуша»), 10) Сімяонаўская (Багаяўленская) царква, 11) Свята-Мікалаеўская (Батальённая) царква, 12) Крыжаваздзвіжанская царква і могільнік, 13) Спаская царква, 14) Іаана-Багаслоўская царква (Камуністычная вуліца), 15) Свята-Мікалаеўская царква і могільнік, 16) Уваскрэсенская-Заручаўская царква, 17) Свята-Ільінская царква, 18) Петрапаўлаўская царква, 19) Царква Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, 20) Свята-Міхайлаўская царква і могільнік, 21) Свята-Троіцкая царква, 22) Царква Святога Лазара Праведнага, 23) Царква Божай Маці Усіх Смуткуючых, 24) Семінарская Свята-Ануфрыеўская царква ў Маркавым Свята-Троіцкім манастыры, 25) Свята-Троіцкая царква, 26) Царква Святога Мітрафана, 27) Свята-Пакроўскі храм (цяпер Казанскай іконы Божай Маці); вучылішчы, гімназіі і г.д.: 1) Духоўная семінарыя, 2) Аляксандраўская гімназія, 3) Духоўнае жаночае вучылішча, 4) Духоўная кансісторыя, 5) Духоўнае мужчынскае вучылішча.

Прапануецца вярнуць старыя назвы вуліцам.

Праваслаўныя суполкі, якія рэгіструюцца ў цяперашні час, не маюць неабходных сродкаў для правядзення рэстаўрацыйных работ.

Мы не разбуралі, а ствараралі культурную спадчыну свайго народа, таму, зноў ствараючы, звяртаемся да дзяржаўных арганізацый, заклікаем калектывы прадпрыемстваў, устаноў, кааператываў, грамадзян горада ўнесці пасільны ўклад у збор сродкаў на адраджэнне і рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры XII—XIX стагоддзяў.

Жадаючыя могуць унесці свой пасільны ўклад, прадставіўшы, калі маюць, фотаздымкі, чарцяжы гістарычных помнікаў або царкоўныя рэчы, кнігі, іконы.

Епархіяльнае Упраўленне.

Візіт патрыярха

Апошнім часам, калі паўстала пытанне падпісання Саюзнага дагавора, у Беларусь, магчыма, і не з гэтай нагоды, але зачасцілі знакамітыя госці з Масквы. Яшчэ не паспелі людзі забыцца пра візіт М. С. Гарбачова, як зусім нядаўна прыязджаў Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II. Свой візіт ён пачаў з наведання плошчы Перамогі і ўскладання вянка да абеліска. У той жа дзень правіў малебен у Крыжовай царкве, асвячонай у гонар Сабора Беларускіх святых, затым у Свята-Духавым кафедральным саборы адбылася ўсяночная служба. Наведаў Жыровіцкі манастыр, а ў ім духоўную семінарыю. У Мінску благаславіў месца будаўніцтва новага храма ў гонар іконы Божай Маці «Усіх журботных Радасць», а таксама адслужыў паніхіду ў Курапатах.

На завяршэнне візіту Патрыярх наведаў Гомель і Магілёў. І ўсюды Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II беларускі народ сустракаў з вялікай радасцю і павагай. Шкада, аднак, што Патрыярх ні разу не звярнуўся да жыхароў Беларусі на іх роднай мове. А ёсць жа добры прыклад: папа рымскі, сустракаючыся з беларускімі дзецьмі, якія прыехалі ў Італію, размаўляў з імі па-беларуску.

Віктар ШНІП.

Загадана маўчаць

Газета «7 дней» № 20 (72) ад 13—19 мая гэтага года перадрукавала мой ліст, запазычыўшы яго з газеты «Наша слова» ад 27 сакавіка — 2 красавіка гэтага года. І вось дзіва. Надрукавала на мове арыгінала — на «тэй мове, якой азваўся беларус». Знайшліся ў наборы нават друкарскія літары «ў» ды «і». Значыць могуць. Могуць ды не хочуць. Чаму? Растлумачыў галоўны рэдактар А. Пранішнікаў у «рэцэнзіі» да перадрукаванага майго ліста. Хацеў ці не, але растлумачыў.

Калі я слухаў Пранішнікава ў мінулым годзе па тэлевізары, дзе ён гразіў не выдаваць беларускамоўны варыянт газеты, то думалася, што гэта асабістае меркаванне камерсанта, дзялка. Я не мог дапусціць нават думкі, што яму ўдасца прапіхнуць сваю ідэю праз БЕЛТА. Усё ж такі гэта тэлеграфнае агенцтва рэспубліканскае і да таго ж называецца Беларускім. Аднак прапіхнуў і стараецца апраўдаць гэта рыначнай эканомікай, не беручы пад увагу тое, што такое апраўданне з'яўляецца канюнктурнай спекуляцыяй і скажэннем ідэй перабудовы. Старшыня Вярхоўнага Савета БССР М. І. Дземянцей адзначыў на IV сесіі: «Ні ў якай меры не павінны пацярпець ад рынку выхаванне і адукацыя, ахова здароўя і іншыя галіны». Не цяжка зразумець, што можа «выхаваць» уціск беларускай мовы.

Пранішнікаў выдаў мне рэкамендацыі, што чытаць з перыёдыкі. Сутнасць такая: хочаш чытаць па-беларуску — чытай сваю «архирадикальную» ЛіМ і будзь здароў (не ўстрымаўся, каб не ўбрыкнуць!). А «нашу» не чапай. Калі хочаш мець беларускі варыянт, станавіся спонсарам.

Ці трэба тлумачыць, што я ўсё жыццё, як увесь народ Беларусі, быў «спонсарам», плаціў прамыя і ўскосныя падаткі. Апошнія плачу і зараз. І нават прамы — прэзідэнцкі. З гэтых сродкаў складаецца бюджэт рэспублікі і не толькі рэспублікі. Шмат што патрабуе і датацый з гэтага нашага спонсарскага бюджэту. Асабліва ў беларускіх умовах, калі ў выніку блюзнерства аб «зліцці нацый» усё здратавана, зганьбавана, збэшчана. У 30-х як пачалося, так і пайшло: знішчалася нацыянальная інтэлігенцыя, эканамічна актыўная частка сялянства. Па звестках «архірадыкальнай» ЛіМ ад 24 мая гэтага года пад рэпрэсіі трапілі каля 200 пісьменнікаў Беларусі. Знішчаліся і не друкаваліся іх творы. Пасля вайны амаль тры пакаленні беларусаў атрымоўвалі асвету на чужой мове, пры абавязковым сярэднім навучанні. Зачыняліся беларускія школы. Ад бацькоў вымагалі заявы на адмову ад навучання дзяцей на роднай мове. Ім казалі: беларуская мова не мае перспектывы, будзе перашкодай пры паступленні ў ВНУ. Гэта я чуў на свае вушы. Ды што там казаць пра тое, што ўсе ведаюць! Гэта зараз афіцыйна асуджана як культ, валюнтарызм, стагнацыя, заганная нацыянальная палітыка партыі. А што робіцца, каб выправіць становішча? Каб нешта змяніць, трэба пры неабходнасці ісці і на датацыі.

Мой ліст настолькі раззлаваў Пранішнікава, што ён пачаў мне пагражаць параграфам закона аб статусе беларускай мовы. Але ж той закон, тыя ж параграфы абараняюць і мяне ад уціску і прыніжэння маёй нацыянальнай годнасці. Бачна, што Пранішнікаў у мроях бачыць мяне і мне падобных за калючым дротам лагернай зоны. Ён нават ужыў у трэцяй асобе зварот да мяне — «гражданин». А можа яму мроіцца надзвычайнае ваеннае становішча і новы 1937 год?

Так, трэба жыць у згодзе без уціску нацыянальнай годнасці адных другімі. Толькі гэта дасягаецца не тым спосабам, які выбраў сабе за методу галоўны рэдактар газеты «7 дней». З адсеяных «не наших» падпісчыкаў ніхто ўдзячны не будзе, бо з «рыначнай упакоўкі» газеты вылазяць рожкі дыскрымінацыі. Маніпуляцыю з газетай «7 дней» нават пры жаданні нельга аднесці да з'яў пазітыўных.

Дарэчы, прыязджаюць да нас людзі розныя. Адны з душой нахлашч, другія з «місіяй» за пазухай. Прыязджаў гэтак нядаўна з Масквы эмісар адной «архіпатрыятычнай» арганізацыі, ведаючы, што талерантныя беларусы не спытаюць: «Што табе тут трэба?» Відаць, гэты «патрыёт» «великой и неделимой Российской империи» шукаў тут «триединую» глебу, каб пасеяць на ёй чартапалох вялікадзяржаўнага шавінізму і антысемітызму?! І хто яго папулярызаваў найбольш актыўна? «7 дней». Каменціраваць не буду. Скажу толькі: усё ж патрэбен заслон у выглядзе закона аб грамадзянстве, бо дай перакаці-полю волю, яно забароніць усе мовы, апрача імперскай. Такое ўжо было ў нашай гісторыі, пры чым забаранялася, чамусьці, толькі беларуская мова.

Могуць сказаць: дык гэта ж было даўней. Але вось адзін «велікабратні» паэт, пазіраючы ў наш бок, выдаў такія радкі:

Возле Бреста стоят обелиски,
Там Россия начало берет.

Відаць, гэты паэт разглядае Беларусь як «сферу влияния»? Знайшоўся кампазітар, які напісаў на яго словы музыку, знайшлася тэлепраграма, якая выдала гэта ў эфір. Прыклады магу множыць.

Пранішнікаў, канешне, не адказвае за чужыя ўчынкі. Гэта так. Прывёў я іх для прыкладу. А вось за свае дзеянні, што перашкодзілі выхаду ў свет беларускамоўнага варыянта газеты «7 дней», як?.. Я не буду пужаць Пранішнікава Законам аб мовах, як гэта робіць ён, смальнуўшы шротам параграфаў па «рядовому пенсионеру». Ды так, каб рыкашэтам па дэпутату. Хай застанецца на яго сумленні і зман — з беларускім варыянтам газеты.

Дарэчы, з пачатку водпаведзі мне ён прызнае: планаваўся двухварыянтны выхад газеты, а пад канец сцвярджае, што зману не было. Быў. І пры падпісцы на 1991 год таксама. Работнікі сувязі не былі папярэджаны, што беларускі варыянт газеты з-за адвольных маніпуляцый скасуюць. Я бесперашкодна падпісаўся на гэты варыянт на 1991 год. Магу пацвердзіць квітком. Падвох адчуў, калі пачаў атрымліваць не тое, што выпісаў. Дык што ж, маўчаць і дзякаваць?

В. ШЫДЛОЎСКІ,
пенсіянер,
г. Мінск.

У дадатак да сказанага. У чарговы раз А. Пранішнікаў у 21-м нумары сваёй газеты выступіў з павучаннем беларусам, як трэба рабіць грошы: «Уж если и считать деньги в чужом кармане»... і г. д. У гэтым глыбокім «кармане» і патануў беларускамоўны варыянт газеты. У ім жа патанулі і грошы «рядового пенсионера», уздумаўшага падпісацца на той варыянт.

«Але зніклі «Лякарня» і Ваш Ко-Ко»...»

У адказ на заклік рэдакцыі адзначаць самім чытачам лепшыя матэрыялы года, хачу паведаміць, што асабіста я з задавальненнем прачытаў публікацыі С. Дубаўца, Э. Ялугіна і Л. Вашко.

Наогул, змест нумароў «Нашага слова» мне падабаецца. Але вось шкада, кудысьці зніклі «Лякарня» і Ваш Ко-Ко.

З павагай Паўло СВЯТАЯННЫ.

АД РЭДАКЦЫІ. «Лякарню» рыхтуем, ёсць планы пашырыць штат лекараў і правізараў. Што тычыць Вашага *Ко-Ко*, то ён таксама зноў узнік у нашай хаце і тое-сёе прапанаваў. У яго аказаліся стойкія прыхільнікі ў чытацкай грамадзе, так што будзем з гэтым лічыцца.

Днямі ў Мінск наведалася супрацоўніца беластоцкай газеты «Ніва» Міра Лукша, з якой сустрэўся наш карэспандэнт і задаў ёй некалькі пытанняў.

— У першую чаргу хачу задаць пытанне, якое не дае спакою многім беларусам на Беларусі: чаму да нас не прыходзіць «Ніва»?

— На гэтае пытанне адказаць нялёгка, бо ў вас у рэспубліцы і ў нас апошнім часам прымаюцца розныя законы, якія і перашкаджаюць распаўсюджанню нашай газеты. Асабліва нам перашкаджае ваш Саюздрук, які патрабуе ад нас вялікія грошы; і нам праз яго няма ніякага сэнсу распаўсюджвацца — не акупіцца нават кошт паперы. Мы думалі распаўсюджваць «Ніву» праз ваш Фонд культуры, але і тут нічога не

Ды што гэта за жыццё?

атрымалася. Па закону мытні мы можам перадаць «Ніву» Фонду культуры толькі на дзвесце рублёў, а гэта значыць — 400 экземпляраў, хаця на Гродзеншчыне можна распаўсюдзіць не менш як тысячу паасобнікаў. Цяпер мяркуем дамовіцца з Саюзам журналістаў БССР, каб ён дапамог распаўсюджваць нашу газету.

— Якія культурныя мерапрыемствы ў бліжэйшы час адбудуцца на Беласточчыне?

— 12—14 ліпеня ў Гарадку ля Беластока адбудзецца фестываль маладзёжнай музыкі, які арганізуе БАС. Чакаем прыезду рок-гуртоў «Мроя», «Уліс», «Новае неба», а таксама ўсіх, хто здолее вырвацца з Беларусі.

— Як апошнім часам у вас адносяцца да беларусаў, якія не забыліся, што яны беларусы?

— Калі папраўдзе — то шмат беларусаў звольнілі з працы, а хто яшчэ застаўся, дык тым працуецца не вельмі соладка. Так з «Сучаснай газеты» звольнілі Янку Целушэцкага і Паўла Гілеўскага. Яны шмат пісалі пра беларускія справы ў Польшчы і на Беларусі.

— Але ж неяк жыць можна беларусам?

— Зразумела, можна. Але хто як уладкуецца. Напрыклад, Міхась Шаховіч купіў на аўкцыёне месячнік «Кантрасты», які мае добрыя рэпарцёрскія традыцыі. Купіў даволі танна — за чатыры мільёны. «Кантрасты» выходзяць на польскай мове, і Міхась думае пры газеце выдаваць беларускі дадатак.

— Рэдакцыя «Нашага слова» месціцца ў адным невялічкім пакойчыку. А як у вас справы з памяшканнем?

— Да нядаўняга часу будынак, у якім знаходзіцца рэдакцыя «Нівы», быў уласнасцю партыйнага канцэрна РСВ, і калі «Салідарнасць» прыйшла да ўлады, гэты канцэрн пачалі ліквідоўваць. Былі распрададзены загалоўкі газет. РСВ пазбавілася ад «Нівы» яшчэ задоўга да ліквідацыі канцэрна, і цяпер нас апякае польскае міністэрства культуры. Наш будынак стаіць у добрым месцы, і зусім нядаўна яго перадалі ваяводу. Нейкі банк прапанаваў за гэты будынак ваяводу трыццаць мільярдаў злотых, але ваявода аддаў яго бясплатна «Салідарнасці». Цяпер у гэтым будынку размешчана праўленне «Салідарнасці», незалежны часопіс «Плюс», «Сучасная газета», бюро аб'яў і наша «Ніва». Мы плацім за арэнду памяшкання вялікія грошы і не ведаем, што з намі будзе праз тыдзень. Час ад часу нам б'юць шыбы, і не толькі нам, таму штодзённа даводзіцца глядзець, каб нашу рэдакцыю не абрабавалі. А ў нас ёсць што панесці, бо міністэрства культуры нядаўна нам купіла камп'ютэр з друкарскай машынай.

— Як у вас на Беласточчыне наконт літаратурнага жыцця?

— У нас існуе літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Белавежа», пры якім выдаецца бібліятэчка. Цяпер з выданнем зборнікаў стала крыху лягчэй, бо для гэтай справы ёсць такія-сякія грошы, якія нам дае ваяводская ўправа. Зусім нядаўна быў арганізаваны літаратурны семінар, на які прыязджалі Алесь Разанаў і Уладзімір Конан.

— Як вы, беластоцкія беларусы, гледзіцё на нас, савецкіх беларусаў?

— Як кажа старшыня БГКТ Аляксандр Баршчэўскі, мы едзем у Беларусь як да крыніцы нашай мовы, нашай культуры, а калі прыязджаем, то бачым, што гэта крыніца амаль мёртвая.

— А ці верыце ў наша Адраджэнне?

— Апошнім часам пачалі верыць, бо вельмі спадзяёмся на Закон аб мовах. Ды і Дземянцей час ад часу стараецца хоць некалькі слоў сказаць па-беларуску, што вельмі радуе нас на Беласточчыне....

— Зусім нядаўна ў вас палілі праваслаўныя храмы. Гэта палітыка ці што іншае?

— Па-мойму, нельга сказаць, што гэта нейкая абсалютна палітычная справа. Часта гэта толькі справа звычайных бандытаў, якія рабуюць і нішчаць храмы, і не толькі на Беласточчыне.

— Вам часта даводзіцца прыязджаць у Беларусь. Як вы лічыце: добра мы жывём ці не?

— У нас у Беластоку на сцяне адной крамы напісана па-беларуску: «Жыве Беларусь!», а побач — па-польску: «Але што гэта за жыццё?» Вось вам мой адказ.

Распытваў
В. ШНІП.

Старонкі гісторыі

СТАНАЎЛЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Вадзім САЛЕЕЎ

Пачатак у № 19.

Да нядаўняга часу іх было (асноўных) тры: яны трактуюць апазіцыі волі і няволі (Белая і Чорная Русь), хрысціянства і паганства (тая ж самая апазіцыя). Я. Карскі нагадваў этнаграфічныя рысы: светлы тып жыхароў і белае адзенне (ад ільну). Нядаўна з'явілася яшчэ адно тлумачэнне. Згодна з ім (В. Іваноў, А. Рогалеў) Белая Русь — гэта Заходняя Русь. Праўдзівей кажучы, «беларусамі» альбо, што было часцей, «беларусцамі» называлі іх некаторыя суседзі, большай часткай жыхары Рускай цэнтралізаванай дзяржавы. У цэнтральнай частцы Беларусі і некаторых заходніх рэгіёнах яе аж да пачатку XX стагоддзя найбольш распаўсюджаным этнонімам для абазначэння жыхароў быў этнонім «літвіны» («ліцвіны»).

Назва «літвіны», як адзначаюць даследчыкі (І. Чаквін), у XVI—XVIII стст. набыла гучанне палітоніма дзяржаўна-палітычнага вызначэння, напрыклад, як у наш час — «савецкі чалавек». Этнічна яна ахоплівала ў якасці саманазвы групы славянізаванага літоўскага, але перш за ўсё — беларускага насельніцтва. Суседзі, галоўным чынам палякі і рускія, на працягу стагоддзяў павінны былі дыферэнцыраваць у прадстаўнікоў палітоніма «літвін» іх этнічны субстрат: «літвіны рускага роду», «літвін, родам паляк», «рускія князі літоўскага роду» і г.д. Паступова, на працягу XVI—XX стст. этнонім «літвіны» з уздымам самасвядомасці этнічных літоўцаў робіцца нараўне з этнонімам «беларусы» амаль ці не галоўным у абазначэнні прыналежнасці чалавека да беларускага этнасу.

Трэба адзначыць, што для вялікай часткі рэгіёнаў Беларусі, асабліва заходніх, у XV—XIX стст., як аб гэтым сведчыць наш славуты зямляк Адам Міцкевіч, быў распаўсюджаны этнонім «русіны». «...З усіх славянскіх народаў,— пісаў ён,— русіны, гэта значыць, сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рыс. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі Літоўскі Статут напісаны іх мовай; самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш зменены. Усю сваю гісторыю на зямлі яны прайшлі ў страшэннай галечы і прыгнёце».

Этнонім «русіны», пачынаючы з XIII—XIV стст., ужываўся для вызначэння карэннага насельніцтва Беларусі і Украіны, таксама быў і паказчыкам канфесійнага вызначэння чалавека, большай часткай праваслаўнага альбо выхадца з праваслаўных зямель Вялікага Княства Літоўскага. Так, напрыклад, Францыск Скарына зафіксаваны ў актавых запісах Падуанскага універсітэта (Італія) за 1512 г. у якасці «русіна». Дарэчы, сітуацыя з першадрукаром яскрава паказвае ўсе складанасці і цяжкасці з фарміраваннем беларускай нацыянальнай самасвядомасці на першым, вельмі значным этапе яе зараджэння.

У рэктарскіх актах Ягелонскага (Кракаўскага) універсітэта за 1506 г. Скарына вызначаны як «літванус» («літвін»). Тут можна меркаваць па-рознаму: альбо Скарына разглядаўся як жыхар Вялікага Княства Літоўскага («літвін»), альбо ён меў пэўныя адносіны да каталіцкай канфесіі (на што ўказвае і яго імя). Пры ўсім тым, як піша І. Чаквін, «усходнеславянскае і іменна беларускае (а не літоўскае) этнічнае паходжанне роду Скарынаў не выклікае сумнення. Пра гэта сведчаць імёны яго бацькі і родзічаў, славянская этымалогія самога слова «Скарына» і пераважна ўсходнеславянскі арэал існавання».

Такім чынам, у час Ф. Скарыны, у XVI ст., на завяршальным этапе фарміравання беларускай народнасці дакладны этнонім, які сведчыў бы менавіта аб беларускай самасвядомасці, знойдзены не быў. І. Чаквін указвае на больш частае ўжыванне Ф. Скарынам этноніма «русін» у «...якасці саманазвы, аб чым сведчыць... выказванне: «Аз... нароженый въ руском язык».

Гэты выраз ставіць кропкі над «і» ў звышскладанай сітуацыі з беларускай этнічнай самасвядомасцю.

Больш чым тысячагадовая традыцыя культуры ўсходніх славян паняцце «мова» («язык») сінанімічна ставіла ў адзін рад з паняццем «народ». Моцнае ж прыцягненне этнанімічных паняццяў «рус», «рускі», «Руская зямля», што асвячалася гэтай традыцыяй, сказвалася спрадвеку. Таму асэнсаванне таго, што ў XVI ст. тыя або іншыя з'явы належаць ужо культуры беларускай, а не «рускай», цяжка давалася нават колам нацыянальнай інтэлігенцыі.

Працяг будзе.

Юбілеі

Івану Люцыянавічу Неслухоўскаму — Янку Лучыну (1851—1897) — аднаму з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры 6 ліпеня спаўняецца 140 гадоў. Паэт пахаваны ў Мінску на Кальварыйскіх могілках побач са сваім бацькам. Абедзве магілы недагледжаныя. Помнік на магіле Лучыны-бацькі пахіліўся, у любы момант можа ўпасці на магілу сына і разбіцца. Аднак людзі, якія адказваюць за ахову помнікаў нашай культуры, пра гэта не ведаюць, або не хочуць ведаць. І няўжо гэта нармальна, калі краязнавец Генадзь Равінскі, які жыве ў Валожынскім раёне, прыязджаючы ў Мінск, ходзіць па высокіх дзяржаўных установах, просячы, каб паклапаціліся аб магілах Неслухоўскіх?

Цікава: хто 6 ліпеня прыйдзе да магілы Янкі Лучыны?

В. ШНІП.

Янка ЛУЧЫНА

Роднай старонцы

Ты параскінулась лесам, балотамі,
Выдмай пясчанай, неўраджайнаю,
Маці-зямліца, і ўмалотамі
Хлеба нам мерку не даш звычайную.

А сын твой, беднаю адзет сярмягаю,
З лыка пляцёныя лапці абуўшы,
Едзе драбінамі ці калымагаю,
Конем, што цягне, як бы заснуўшы...

Усё ў табе бедна. Часта заплача
Мужык-араты дзеля злой долі,
Цяжка працуючы. Ён жа, аднача,
З табой расстацца не жджэ ніколі.

І непрыглядную хату з пажыткамі,
І поле скупое, выган без пашы
Мы, апрануўшыся старымі світкамі,
Любім і цэнім — бо яны нашы.

Дасць Бог крывавым потам аратаму
Здабыць пясчану зямліцу здарыцца,
Быць добра сытаму, хоць небагатаму,
А дзеля празніка чарка нам зварыцца.

Сонца навукі скрозь хмары цёмныя
Прагляне ясна над нашай ніваю,
І будуць жыці дзеткі патомныя
Добраю доляй — доляй шчасліваю!

У суполках ТБМ

«Выбранцы» — міліцэйская сябрына

СЯБРЫНУ Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны стварылі афіцэры мінскай міліцыі. У сваім выступленні на II з'ездзе ТБМ сябра гэтай суполкі маёр міліцыі В. Краніўка, між іншым, спыніўся і на рабоце, якую праводзяць нацыянальна свядомыя міліцыянеры. Наш карэспандэнт сустрэўся са старшынёй сябрыны, намеснікам начальніка аддзялення ўнутраных спраў Партызанскага раёна, капітанам Сяргеем Казачкоўскім.

— Памятаеце той час, калі беларушчына існавала як бы па-за правам. Тым, хто задужа ўлягаў у яе, неаднойчы даводзілася сутыкацца з органамі правааховы. Таму сёння прыемна здзіўляе тое, што міліцыя самахоць пачынае прыходзіць у беларускае жыццё.

— Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Думаю, што гэтая з'ява будзе пашырацца. Я ўжо не кажу пра тое, што заявіў беларускі парламент: давядзецца ўсім установам, арганізацыям, грамадзянам перахадзіць на беларускую мову. Становішча з нашай культураю крытычнае. Трэба, каб кожны беларус згадаў дух сваіх прашчураў, дух Бацькаўшчыны. Таму ва ўсіх установах, арганізацыях, на прадпрыемствах, у калгасах усім нацыянальна свядомым беларусам варта аб'яднацца дзеля адраджэння беларускай мовы. Міліцыя заўсёды ахоўвала законы. Закон пра мову, лічу, яшчэ неаднойчы давядзецца бараніць. Таму мы стварылі сябрыну найперш з праваахоўных меркаванняў.

— Напэўна, таму яна называецца «Выбранцы»?

— Так. Назва прыйшла да нас са старажытных часоў. У Вялікім Княстве Літоўскім гэтак называлі людзей, якія ахоўвалі магнатаў. Вядома, нашая дзейнасць распаўсюджваецца не на магнатаў, а на законы.

— Чым зараз займаецца сябрына?

— Мы распрацоўваем свой статут. Паводле ягоных патрабаванняў мы збіраемся рабіць паслугі па ахове прадпрыемстваў, грамадзян, маёмасці. Нам ужо даводзілася ахоўваць розныя грамадскія мерапрыемствы, арганізацыі. Надалей думаем весці работу з дзецьмі, пастараемся далучыць іх да роднай культуры. Як вядома, з дзіцячага асяродка вырастаюць нацыянальныя люмпены, рыхтуе сабе «падмогу» злачынны свет. Хочам наладзіць у сябрыне курсы па вывучэнні беларускай мовы. Зараз «выбранцы» самастойна вывучаюць родную мову. Існуе сябрына зусім мала. Таму планаў пакуль што болей за зробленае.

— Хто ўваходзіць у склад сябрыны?

— Гэта афіцэры розных аддзяленняў унутраных спраў горада Мінска. Усяго нас — дванаццаць чалавек. Мяркуем пашыраць кола сяброў ТБМ сярод міліцыі, далучаць да беларушчыны сяржанцкі састаў. Беларускі міліцыянер павінен ведаць мову таго народа, чые правы і законы ён бароніць.

— Як можна звязацца з сябрынаю?

— Праз ТБМ імя Францішка Скарыны. Даведкі можна атрымаць па тэлефоне 33-25-11.

Гутарыў Л. ВАШКО.

Заплаціў жыццём

(Да 100-годдзя з дня нараджэння Пятра Бузука)

ПОМНІЦЦА, калі я пасля вучобы ў Ленінградскім універсітэце прыехаў у 1958 г. на працу ў Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР, уразіла мяне колькасць людзей, што прыходзілі ў кабінет вучонага сакратара з даведкамі аб рэабілітацыі сваіх мужоў, бацькоў, блізкіх... Уразіла фармулёўка ў адной з даведак: «умер от кровоизлияния в мозг в Ленинградской тюрьме «Кресты», што пакідала адкрытым пытанне аб тым, як сустрэў сваю смерць чалавек, — атрымаў кулю ў патыліцу, як яно звычайна бывала, быў забіты ка́тамі, што патрабавалі падпісаць данос на сябе і знаёмых, ці сам разбіў сабе галаву, не вынесшы здзекаў. Паводле адной з версій, апошняе выбраў сабе Пётр Бузук, выдатны беларусіст і славіст, мовавед, што мае выключныя заслугі перад беларускім мовазнаўствам. Яго імя трэба паставіць побач з імем Яўхіма Карскага, які заклаў падмурак беларускай філалогіі.

Відаць, такі ўжо лёс нашай мовы, што занядбаная і пакрыўджаная шмат якімі беларусамі, яна прыцягвае, як магніт, увагу і сэрцы даследчыкаў з іншых краёў, адным з якіх быў Бузук. Застаецца загадкай, што, акрамя глухіх і непацверджаных чутак пра нейкую даўнюю сувязь продкаў з Беларуссю, прымусіла маладога вучонага, які толькі што бліскуча абараніў доктарскую дысертацыю, кінуць універсітэцкае асяроддзе з багатай традыцыяй і бібліятэкамі і пераехаць у толькі што створаны Беларускі універсітэт па запрашэнню рэктара У. Пічэты. Мала таго, літаральна за некалькі месяцаў авалодаць беларускай літаратурнай мовай, каб чытаць на ёй лекцыі, пісаць навуковыя працы, мастацкія творы і рабіць пераклады, практычна і навукова спазнаць народна-дыялектную мову, каб займацца беларускай лінгвагеаграфіяй, што стала любімым накірункам яго працы ў мінскі перыяд. Цяжка паверыць, што гэта тлумачыцца выключна атмасферай нацыянальнага Адраджэння, што панавала ў той час у Мінску, бо колькі зацятага непрымання ўсяго беларускага ў асяроддзі старой інтэлігенцыі сустракалася і ў тыя гады. Але за сваю палымяную прыхільнасць да беларускай мовы і беларускага народа Пятру Бузуку прыйшлося заплаціць жыццём. Што ж зрабіў для беларускага мовазнаўства Бузук за тыя няпоўныя 10 год, калі ён мог плённа працаваць на гэтай ніве? Якія новыя ідэі і канцэпцыі прынёс ён у навуку? Спадчына Пятра Бузука настолькі змястоўная і разнастайная, што каб адказаць на пастаўленыя пытанні трэба было б напісаць грунтоўнае даследаванне. І такое даследаванне раней ці пазней будзе напісана. Цяпер жа абмяжуемся разглядам тых ідэй і прац, якія, на нашу думку, былі найбольш наватарскімі, істотным чынам паўплывалі на шляхі развіцця беларускай лінгвістыкі.

Адной з галоўных ідэй, якую Бузук настойліва праводзіў у сваіх працах, была ідэя аб тым, што «беларуская мова — раўнапраўны сябра ў сям'і славянскіх моваў, які мае права на пачэснае месца сярод моваў сусвету». З сучаснага пункту погляду здаецца, што ў такім сцверджанні няма нічога новага. Аднак варта нагадаць, што яшчэ ў пачатку нашага стагоддзя, выдаючы сваю грунтоўную працу «Беларусы», Яўхім Карскі вымушаны быў называць беларускую мову «наречием», г. зн. часткай рускай мовы, хаця з усяго зместу гэтай працы выцякала яе несумненная арыгінальнасць і самастойнасць. Абгрунтаваннем ідэі непаўнацэннасці беларускай мовы Бузук лічыў тэорыю так званай прарускай мовы. Абапіраючыся на дасягненні славянскай лінгвагеаграфіі, і ў першую чаргу на свае ўласныя даследаванні ў гэтым кірунку, ён сцвярджаў, што «для кожнай групы дзьвюх, трох славянскіх моваў заўсёды можна падшукаць таксама некалькі агульных іх зьяў, але гэта не дае нам права зараз-жа ўтвараць тэорыю іх паходжаньня ад агульнай прамовы». Ён даводзіў, што беларуская мова не «малодшая сястра», бо мае сваю прадгісторыю і гісторыю (прадгісторыяй мовы ён называў эпоху да з'яўлення пісьменнасці, а яе гісторыяй — пасля пачатку пісьменнасці). Падводзячы вынікі аналізу шматлікіх фактаў, што сведчылі ў карысць гэтага, у сваёй вядомай працы «Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў» Бузук канстатаваў: «Гэткім чынам, бачым мы, што ўтварэньне беларускай мовы, г. зн. узьнікненьне галоўных фонэтычных і морфолёгічных зьяў, характэрных для большасьці беларускіх дыялектаў, а таксама для бел. літаратурнай мовы, у XIII — XIV стст. было скончана, г. зн. прыблізна тады, калі сфарміраваліся і іншыя славянскія мовы». Гэтакім чынам было акрэслена месца беларускай мовы ў часе.

Другая праблема, якая на працягу ўсяго мінскага перыяду жыцця цікавіла Пятра Бузука, — гэта праблема суадносін дыялектаў і літаратурнай мовы, і ў сувязі з гэтым — месца беларускай мовы ў прасторы, г. зн. сярод іншых суседніх моў. Такая цікавасць зноў жа не была выключна тэарэтычнай, калі ўлічыць, што ў славянскім мовазнаўстве прадстаўнікамі розных краін доўгі час праводзілася думка аб тым, што распаўсюджанне большасці дыялектных з'яў на тэрыторыі Беларусі сведчыць, што яна была ў асноўным арэнай іншаславянскіх уплываў. А гэта з'яўлялася падставай для «моўнага імперыялізму». Бузук паказаў, што наяўнасць значнай колькасці з'яў, супольных для беларускай мовы з іншымі суседнімі,— вынік яе геаграфічнага становішча. Ён пісаў: «Некаторыя славісты, звярнуўшы ўвагу на цэнтральнае становішча славацкай мовы сярод трох іншых славянскіх моваў, падкрэсьлівалі яе цікавасць для мовазнаўцаў,— цікавасьць, якая зьяўляецца вынікам гэтага цэнтральнага становішча ўспамянутай мовы. Але бясспрэчна, калі б для гэтых мовазнаўцаў (напр., для Флорынскага) беларуская мова ня была-б «наречием единого русского языка», яны тое самае па-вінны былі-б сказаць і адносна нашай мовы, якая знаходзіцца паміж польскай, украінскай і дзьвюх падмоў расійскай мовы. Дзякуючы такому цэнтральнаму становішчу, мы знаходзім у беларускай мове рысы, агульныя з кожнай з пералічаных суседніх груп». Пятру Бузуку належыць вызначэнне і тыпалагічнага профілю беларускай мовы на фоне іншых славянскіх моў, што звязваецца з такім яе цэнтральным становішчам і аўтахтоннасцю насельніцтва. «Між іншым, індывідуальнасць беларускай мовы... становяць у значнай меры не перажытыя процэсы, а асаблівасьці, якія зьяўляюцца захаваньнем спрадвечнай спадчыны. Гэтую некаторую архаічнасьць беларускай мовы, можа, трэба тлумачыць тым, што продкі беларусаў, параўнаўча з іншымі славянамі, вельмі мала перасоўваліся ў прасторы».

Найважнейшым дасягненнем Бузука была распрацоўка пытання аб т. зв. моўнай мяжы, на якім шмат гадоў раней, ды нярэдка і ў наш час узнікалі і ўзнікаюць спекуляцыі, што становяць аснову для экспансіянісцкіх і сепаратысцкіх памкненняў. У сваёй капітальнай і сапраўды наватарскай працы «Спроба лінгвістычнае географіі Беларусі» вучоны паказаў, што моўная мяжа не можа вызначацца выключна па той ці іншай асаблівасці ці шэрагу такіх асаблівасцей, бо «злучнасьць усіх жывых гутарак, якія адносяць да тэй ці іншай мовы, уласна кажучы, ня мае характэрных толькі для іх і агульных усім ім адзнак». Праблема моўнай мяжы звязваецца вучоным са сферай уплыву літаратурнай мовы. Без высвятлення адносін таго ці іншага дыялекту да літаратурнай мовы немагчыма вызначыць граніцу паміж дзвюма суседнімі славянскімі мовамі на спрэчнай тэрыторыі. З'яўленне літаратурных моў, у тым ліку і беларускай, «ёсьць вынік розных, даволі складаных — гістарычна-эканомічных і культурных умоў. Калі з якіх-небудзь прычын тэй ці іншай славянскай гутарцы (можа, нават, гутарцы якога-небудзь гораду) пашанцавала зрабіцца мовай літаратуры, а таксама мовай дзяржаўна-эканомічных зносін, да яе тады пачынаюць цягацець суседнія гутаркі. Такія цэнтры аб'яднаньня маглі зьяўляцца ў розных мясцох. Разыходзячыся праменьнямі, сіла гэтых аб'яднаўчых фактараў, чым далей ад цэнтру, усё больш слабне, і нарэшце ў некаторым месцы гэта сіла павінна зраўняцца з сілай цягаценьня да іншага суседняга цэнтру. Вось тут і можна правесьці граніцу паміж данымі дзьвюма мовамі». У сувязі з гэтым варта прывесці фрагмент з працы Бузука, які датычыць магчымасці існавання т. зв. палескай мовы, якую ён разглядаў выключна ва «ўмоўным ладзе»: «Калі-ж культурна-дзяржаўныя цэнтры ўтварыліся-б у іншых мясцох, ясна, што ў сувязі з гэтым перасунуліся-б і граніцы між мовамі. Ёсьць, напр., нямала зьяў, агульных у паўдн.-беларускіх і паўн.-украінскіх дыялектах, і калі-б чамусьці цэнтр палітычнай і культурнай організацыі зьявіўся-б недзе ў Палесьсі, бясспрэчна, на тэрыторыі пераходных беларуска-украінскіх гутарак утварылася-б і новая палеская мова». Такім чынам, можна сказаць, што ў асноўных навуковых працах Пятра Бузука галоўнай ідэяй з'яўляецца адстойванне правоў і самастойнасці беларускай мовы, за што яму павінны быць удзячны ўсе беларусы.

Генадзь ЦЫХУН.

Ганарар за гэту публікацыю прашу перавесці на рахунак ТБМ імя Францішка Скарыны.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

* * *

Калі да помніка Максіму
Палягуць кветкі па вясне,
Што поўняцца гаючай сілай,
Дык будзе хораша і мне.

Калі ад слова роднай песні
Душу пяшчота ахіне,
Самота светлая ўваскрэсне,
Дык будзе хораша і мне.

Калі мы ўсе — адна радзіна
І ў нашай любай старане
Шануюць маці і Радзіму,
Дык, значыць, хораша і мне.
(З кнігі «Брама»).

«Голас часу»

Чарговы нумар часопіса «Голас часу» (12/3), які выдаецца ў Лондане, адкрываецца цікавым інтэрв'ю супрацоўніка часопіса Юрыя Станкевіча з айцом Аляксеем Рыгоравічам Шынкевічам). Адказы айца Аляксія бясспрэчна зацікавяць беларусаў на чужыне. Пра стварэнне першай палітычнай арганізацыі рэвалюцыянераў пад назвай «Зямля і Воля», пра дзейнасць нарадавольцаў расказвае ў сваім гістарычным нарысе «Нарадавольцы, Ігнат Грынявіцкі і цень К. Каліноўскага» Юры Весялкоўскі. У другім яго артыкуле «Развіццё і пашырэнне хрысцінства» чытач пазнаёміцца з гісторыяй узнікнення першых хрысціянскіх абшчын, з арганізацыяй царкоўнага жыцця, з працэсам развіцця Хрысціянскай літургіі. Друкуецца заканчэнне артыкула М. Гаховіча «Тэалагічны праваслаўна-каталіцкі царкоўны дыялог», у якім ён падкрэслівае, што «немажліва праводзіць дыялог аб з'яднанні Царквы на ўзроўні вернікаў. Дыялог можа быць толькі паміж кампетэнтнымі іерархамі, бо гэта ім даручана пастырства Царквы». Чытачы знойдуць у гэтым нумары працяг артыкула Ю. Свяржынскага «Язафат Кунцэвіч і яго аднадумцы». Апошнія старонкі часопіса прысвечаны 9-й сустрэчы беларусаў Аўстраліі ў Адэлайдзе.

З РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТЫ

ЯК КАТАВАЛІ МОВУ

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя! Падтрымліваю прапанову Вашых баранавіцкіх чытачоў. Мы хочам усё ведаць пра мову, якую адраджаем. Развіццё беларускай мовы са старадаўніх часоў, яе цяжкі лёс — усё павінна цікавіць сумленнага беларуса. Раскажыце, як катавалі нашу мову савецкія камуністы — ленінска-сталінскія паплечнікі.

Наконт рэформы правапісу. Тут мне здаецца, што пакуль рабіць гэта рана. Спачатку няхай Беларусь загаворыць па-беларуску.

З павагай Сяргей СІНЯЎСКІ.
г. Перм.

Пачатак у №№ 18, 19.

У беларускіх словах *ж* і *ш* перад суфіксальным *с* рэкамендавалася не пісаць: *мноства, таварыства.*

Рэформа 1933 г. упарадкавала, паводле прапановы аўтараў праектаў 1930 і 1933 гг., ужыванне апострафа перад ётаванымі галоснымі для вызначэння раздзельнага вымаўлення зычнага з наступным галосным: *б'ю, з'еў, сям'я.* Выключэнне зроблена для *л*, пасля якога трэба пісаць мяккі знак: *рэльеф, Васільеў.*

9. ІНШАМОЎНЫЯ І ЗАПАЗЫЧАНЫЯ СЛОВЫ

Трэці раздзел урадавай пастановы (пал. 9—16-е) рэгламентаваў адно з найбольш складаных і нераспрацаваных пытанняў

Л. СЯМЕШКА.

У 1933-м І ПАЗНЕЙ

беларускай арфаграфіі — **правапіс іншамоўных слоў.** Адсутнасць сталых пісьмовых традыцый і дэталёва распрацаваных правілаў, неакрэсленасць саміх прынцыпаў фанетычнага і арфаграфічнага асваення запазычанай лексікі вялі да значнага разнабою ў правапісе гэтых слоў.

Праблема уніфікацыі напісання іншамоўных слоў, у прыватнасці пытанне аб перадачы на пісьме ненаціскнога вакалізму, актыўна абмяркоўвалася ў ходзе арфаграфічнай дыскусіі 20-х гадоў, а таксама на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе правапісу, дзе былі прадстаўлены розныя пункты погляду (ад прапановы пашырыць на запазычаныя словы прынцып поўнага акання і яканя (пісаць *дапо, таляграма*) да прапановы захаваць у іншамоўных словах ненаціскныя *о, е* (*композыцыя, професор, социолізм*), як гэта склалася ўжо ў пісьмовай практыцы 20-х гадоў). У выніку канферэнцыя прыняла прапанову С. Некрашэвіча аб пашырэнні на запазычаныя словы толькі пераходу *о* ў *а: прафесар, эканоміка, рэвалюцыя*, за выключэннем слоў тыпу *радыё, бруто, какао*, дзе канцавыя ненаціскныя *о(ё)* захоўваюцца. Такую ж рэдакцыю гэтага правіла даюць і аўтары абодвух праектаў правапісу, але дапускаюць пры гэтым магчымасць не націскных *о(ё)* у словах малапашыраных: *рэномэ, блёкада.*

10. АСОБНЫ СТАТУС ДЛЯ «ЗВЫШРЭВАЛЮЦЫЙНЫХ» СЛОЎ

Урадавая пастанова 1933 г. таксама замацоўвае правапіс ненаціскных галосных у запазычаных словах паводле пастановы Акадэмічнай канферэнцыі, аднак робіць выключэнне, абумоўленае, відавочна, пазамоўнымі прычынамі, для дзесятка «інтэрнацыянальных рэвалюцыйных слоў», на якія аканне не павінна пашырацца: *рэволюцыя, совет, большэвік* і г. д. Гэтае выключэнне, як навукова неабгрунтаванае і практычна неапраўданае, пазней было ўсё ж адменена.

11. ЦВЁРДАСЦЬ — МЯККАСЦЬ

У сістэме зычных у іншамоўных словах рэформа закранула найперш перадачу на пісьме цвёрдасці — мяккасці. Згодна з пісьмовай традыцыяй 20-х гадоў, якая складвалася пераважна пад уплывам польскай мовы, цвёрдасць і мяккасць зычных перадавалася ў адпаведнасці з характарам іх у мове-крыніцы: ***мэтод, опозіцыя, філёзофія.*** Адарванасць ад законаў беларускага вымаўлення стварала часта арфаграфічную няўстойлівасць, непаслядоўнасць у афармленні гэтых слоў: *гэрб*, але: *геаграфія, газэта*, але: *экземпляр, кантынгент* і *канцінгент* і г. д. Таму вызначальным у рэфармаванні правапісу зычных было імкненне наблізіць яго да жывога беларускага вымаўлення, «па магчымасці сцерці розніцу паміж сваімі і чужымі словамі» (Праект 1933 г.). Разам з тым улічвалася таксама практыка афармлення гэтых слоў у рускай мове.

Так, новы правапіс замацоўваў перадачу «і» еўрапейскага ў іншамоўных словах «згодна традыцыйна пашыранага ў БССР вымаўлення, г. зн. пераважна цвёрда: *метал, алмаз, балкон.* Але ў тых выпадках, калі іншамоўнае «і» вымаўляецца мякка, пісаць *л* мяккае : *аўтамабіль, асфальт, люстра* і г. д.». Галосныя ***ы, э,*** згодна з урадавай пастановай, рэкамендуецца пісаць толькі пасля ***д, т*** і зацвярдзелых зычных, ва ўсіх астатніх выпадках пісаць ***і, е:*** *фізіка, сістэма* (замест *фызыка, сыстэма* і г. д.), але *методыка, дырэктар.*

Новы правапіс ліквідаваў варыянтнае напісанне слоў іншамоўнага паходжання з гукам ***ф,*** які перадаваўся як ***ф, п, хв, х, т.*** Літарай ***ф*** стала перадавацца грэч. ***фі*** і часткова ***фіта:*** *форма, фабрыка, арыфметыка, арфаграфія*, але: *тэатр, тэзіс, метад.* Такія напісанні падтрымліваліся аналагічным афармленнем гэтых слоў у рускай мове.

Працяг будзе.

ВАШ КО-КО Ў ВЯРХОЎНЫМ САВЕЦЕ

І рублём, і талонам

Больш за ўсё на свеце я ненавіджу крытыканаў, якія абы плявузгаць, лаюць гаварышаў дэпутатаў з беларускага парламента. Я згодны з тым, што не кожнае пытанне таварышам выпадае вырашыць як след. Але ж і працуюць яны ў вельмі цяжкіх умовах. Крытыка нам трэба было б ведаць, што самая цяжкая на свеце праца — сядзячая. І калі, прыкладам, дзень у дзень абмяркоўваць пытанне «Аб узмацненні адказнасці за парушэнні правілаў дарожнага руху ў Беларускай ССР», дык ад нармальнага чалавека спатрэбіцца шмат высілкаў, каб уседзець на месцы, ды яшчэ з гэтакім выразам на твары, нібыта вырашаецца ці не самае сур'ёзнае пытанне на Беларусі за апошнія 300 гадоў. Вы ўявіце, мае ненавідныя крытыканы, гэтакую непрыемную сітуацыю: хтосьці з вашых добрых знаёмых (тут я плюю праз левы плячук, ды божкаю) топіцца ў якім-небудзь віры, а вы, седзячы на беразе, замест таго каб зрабіць ласку небараку, падаўшы яму кіёк, улягаеце ў развагі, куды б гэта паскардзіцца на залішнюю нетаропкасць нашых выратавальнікаў на водах. Ды як бы паспрыяць на ўзмацненне іхняй адказнасці.

Дык ці лёгка вам будзе? Вядома ж, каб гэтак сядзець пры жывым тапельцы, трэба мець асаблівую мужнасць. Вельмі рэдкую. Як у нашых таварышаў дэпутатаў.

Балазе там, дзе гаворка ідзе пра ўзмацненне адказнасці, таварышы парламентарыі асабліва актыўнічаюць. А крытыканы з гэтага шчыруюць сабе. Я гэтым зласлівым дзядзькам і кабетам, што ніяк не ўцямяць, якая трагедыя адбываецца з нашым рахманым народам, даруйце за шчырасць, на пэўны тэрмін ваду ў водаправодзе адключаў бы. Дзеля іхняй жа карысці. Для ўзмацнення адказнасці за іхняе крытыканства. Тады яны, відаць, хутка заўважаць, што беларусы разбэсціліся ўшчэнт. Заробкі ім, бачыце, пападнімалі, а штрафы на ранейшым узроўні пакінулі. Несправядлівасць жахлівая.

Зразумела, і я маю невялікую незадаволенасць з таварышаў. Але ж не імкнуся, як некаторыя, усё на свеце збэсціць. Наадварот, разумею — да пла́чу цяжка парламентарыям, і нават канструктыўную прапазіцыю з вялікімі пакутамі нарадзіў: трэба не толькі штрафаваць на сотні ды тысячы, варта яшчэ падумаць, як бы гэта ў найбольш зацятых парушальнікаў талоны на мыла ці макароны забіраць. Каб больш адказнымі былі.

ВАШ КО-КО.

Другі нумар часопіса «Полацак» пачынаецца з выказванняў вядомых беларускіх пісьменнікаў Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законнікава і доктара гістарычных навук, прафесара Міхася Ткачова, якія зычаць гэтаму новаму беларускаму выданню трывалых поспехаў. Бясспрэчна, чытача зацікавяць успаміны Яна Станкевіча «Узыходзіла сонца незалежнае Беларусі», надрукаваныя з нагоды Дня незалежнасці Беларусі, абвешчанага 25 сакавіка 1918 года. На праблемы беларусізацыі, курс на якую быў афіцыйна абвешчаны на другой сесіі ЦВК БССР у ліпені 1924 года, звяртае ўвагу Леанід Лыч у сваім артыкуле «Беларусізацыя».

У часопісе змешчаны пачатак публіцыстычнай аповесці-хронікі ў дыялогах «Свечкі на дзяды», якую напісаў Эрнэст Ялугін. У рубрыцы «Далёкае і блізкае» выступае з артыкулам «Пачатак» Міхась Белямук, у якім расказвае пра жыццё беларусаў у эміграцыі.

Пра стварэнне і дзейнасць мінскага гарадскога клуба «Спадчына» чытачы даведаюцца з нарыса Святланы Белай «Слова пра «Спадчыну». Тут жа змешчаны і зварот клуба «Спадчына» да суайчыннікаў. Праблемам чарнобыльскай катастрофы прысвечаны артыкул Ірыны Кісялёвай «Чарнобыль; спроба аналізу сітуацыі», пачатак якога надрукаваны ў нумары. Ідэю служэння Бацькаўшчыне, праблемы патрыятызму ў гісторыі грамадскай думкі беларускага народа развівае ў сваім артыкуле «Вытокі нацыянальнай свядомасці» Анатоль Белы.

У часопісе змешчаны шэраг ілюстрацый да яго асноўных матэрыялаў.

Матэрыялы II з'езда ТБМ

ПАСТАНОВА

Да пытання аб рэформе правапісу беларускай літаратурнай мовы

Адзначаючы, што рэформа правапісу 1933 года была гвалтоўнай, прывяла да істотнага збяднення беларускай літаратурнай мовы і мела палітычныя мэты, скіраваныя на выцясненне яе з грамадскага ўжытку ў Беларусі, з'езд рашуча выказваецца за неадкладнае вяртанне беларускай літаратурнай мове яе нацыянальнага аблічча. Разам з тым, высакароднай справе нацыянальнага Адраджэння Беларусі, пашырэння беларускай мовы і культуры ў рэспубліцы, еднасці беларусаў ва ўсім свеце не спрыяе наяўнасць у сучаснай беларускай літаратурнай мове дзвюх правапісных нормаў. Кансалідаваная, культурная нацыя мусіць мець адзіны правапіс.

З'езд даручае Камісіі Таварыства па ўдасканаленню правапісу да канца 1991 года выпрацаваць праект асноўных напрамкаў удасканалення правапісу беларускай літаратурнай мовы і вынесці яго на абмеркаванне грамадскасці.

15 чэрвеня 1991 г. г. Мінск.

ПАСТАНОВА

Дзеля ажыццяўлення Закона аб мовах

1. З'езд ухваляе дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання, народнай гаспадаркі, грамадскіх аб'яднанняў, усіх прыхільнікаў беларускага слова, скіраваную на ажыццяўленне Закона аб мовах у Беларускай ССР, і выказваецца за цеснае супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі ў адраджэнні беларускага слова дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі рэспублікі і за аказанне ім у гэтай высакароднай дзейнасці ўсямернай падтрымкі з боку Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

У парадку заканадаўчай ініцыятывы з'езд выказвае прапанову Вярхоўнаму Савету і Савету Міністраў Беларускай ССР унесці змены ў структуры і рэгламент працы Саветаў народных дэпутатаў рэспублікі ўсіх узроўняў, накіраваныя на стварэнне пры іх паўнамоцных камісій з ліку народных дэпутатаў, актывістаў Таварыства беларускай мовы і іншых патрыятычных грамадска-культурных арганізацый, работнікаў нацыянальнай сістэмы адукацыі, культуры, прыхільнікаў беларускага слова,— дзеля забеспячэння і каардынацыі дзейнасці Саветаў, органаў выканаўчай і судовай улады, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый у межах адпаведнай тэрыторыі па ажыццяўленню Закона аб мовах у Беларускай ССР; мэтазгодна вызначыць у складзе Савета Міністраў Беларускай ССР, органаў мясцовага самакіравання асоб, адказных за ўсебаковае, своечасовае і ў шэрагу выпадкаў паскоранае ажыццяўленне Дзяржаўнай праграмы, зацверджанай урадам у адпаведнасці з Законам аб мовах у Беларускай ССР.

Ахвяравалі на Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Спадар А. Сільвановіч (ЗША) — 50 долараў
Спадар М. Баяроўскі (Англія) — 200 рублёў
Спадар Сяргей Дзейка (Англія) — 200 рублёў
М. Невідомская (Мінск) — 35 рублёў
Г. Вярцінскі (Віннiцкая вобл.) — 20 рублёў
А. Пунцава (Мінск) — 20 рублёў
УМ-1 трэста-1 (Мінск) — камсамольскія ўзносы — 183 рублі 88 капеек

Пажадана, каб ахвяравальнікі называлі поўнасцю сваё прозвішча, імя і імя па бацьку.

Аб'ява

«Наша слова»

можна выпісаць у любым аддзяленні «Саюздруку». Усяго за 20 капеек 4 нумары газеты ў месяц.

— Гэта інфармацыя аб культурным жыцці беларусаў у рэспубліцы і за мяжой.
— Арыгінальныя інтэрв'ю з неардынарнымі асобамі.
— Гісторыя. Радавод.
— Пытанні мовы.
— Літаратурныя навіны і многае іншае ў канцэнтраванай форме.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Рэдактар Эрнэст Ялугін
Сябры калегіі: Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Ніл Гілевіч, Уладзімір Дамашэвіч, Алесь Камароўскі, Анатоль Клышка, Алег Куліцкі, Уладзімір Ламека (нам. рэдактара), Уладзімір Содаль, Алесь Траяноўскі, Генадзь Тумаш, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Міхась Шавыркін.
Адказны сакратар Анатоль Сілянкоў.

Наш адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13.
Тэлефон рэдакцыі: 33-17-83.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара неабавязкова можа адпавядаць меркаванню рэдакцыі.
Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

МВПА імя Якуба Коласа.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка».
Наклад 5.174 паасобнікаў. Заказ 2449. Індэкс 74975.